


# *НА ПАЛАТНЕ ФАНТАЗІІ – РАДЗІМА*

**«Я намалюю дзіўную краіну» – так назвала сваю новую кнігу наша калега па творчым саюзе, дзіцячая пісьменніца з Гродна Таццяна Сучкова *(выдавецтва, «Ковчег», г. Мінск, 2024).***

У кнігу Таццяны Сучковай «Я намалюю дзіўную краіну» ўвайшлі вершы, смяшынкі і казкі, створаныя за апошні час. У кнізе шэсць тэматычных раздзелаў, якія завядуць чытача ў азёрны сіні край, пазнаёмяць з жыхарамі зялёнага лесу, з тымі з'явамі і рэчамі, якімі захапляюцца хлопчыкі і дзяўчынкі падчас канікул у бабулінай вёсцы. А яшчэ – падгледзець і шчыра зачаравацца з'явамі беларускай прыроды ў розныя поры года, павесяліцца, чытаючы аўтарскія смяшынкі і казкі. Кніга прызначана для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

***Анатацыя***

Тэматычныя раздзелы новай кнігі Таццяны Аркадзьеўны маюць назвы: «Над азёрным сінім краем»; «Хто жыве ў лясной дзяржаве?»; «Еду ў госці да бабулі»; «Чаруе нас прырода любой парою года»; а таксама ў выданні два жанравыя раздзелы: «Смяшынкі» і «Казкі».

Вось які зварот ад пісьменніцы да маленькіх аматараў чытання, іх бацькоў і настаўнікаў размяшчаецца на вокладцы кнігі: «Кніга «Я намалюю дзіўную краіну» адвядзе чытачоў у краіну цудаў і чараўніцтва. Пазнаёміць з жывёламі, птушкамі і зачаруе прыродай роднага краю. Вясёлыя вершы, смяшынкі і пацешныя казкі падораць радасць і вясёлы настрой. З вялікім задавальненнем запрашаю ўсіх у незабыўнае падарожжа».

Рэдактар кнігі Л. А. Кебіч. Пераплёт цвёрды. У кнізе 112 старонак. Наклад 100 асобнікаў. Калі ласка, пытайцеся новую кнігу члена СПБ, гродзенскай дзіцячай пісьменніцы Таццяны Сучковай «Я намалюю дзіўную краіну» ў бібліятэках.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**